2. Мягко стелют ...________________________

3. Мал золотник...________________________

4. Книга в счастье украшает...________________________

**3. Вставьте пропущенные буквы. Раскройте скобки.**

1. Я вертела шкатулочку (и)так (и)этак, но (не)смогла ее открыть. 2. (И)так, сегодня мы нач..наем изучать тему «Правописание союзов». 3. Выуч..те правило о правописани.. союзов так(же) сделайте два упражнения на эту тему. 4. Мы отдохнем (за)тем холмом, а (за)тем продолжим наш поход. 5. Мы то(же) были вчера в парке. 6. Так(же), как и вчера хлестал дождь.7. Вы пришли сюда, что(бы) выбрать что-то из произведений В. Астафьева? 8. Что(бы) мне вам предложить? 9. (По)тому переулку проехать мы (не)смогли, (по)тому поехали в об..езд. 10. Мы сильно устали (по)этому легли спать, даже (не)поужинав.

*Дата поступления в редакцию: 13.03.2024*

# ПЛАН-КАНСПЕКТ УРОКА ПА ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕЦЕ “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА” Ў VI КЛАСЕ ПА ТЭМЕ “ІВАН ПТАШНІКАЎ. “АЛЕНІ”. ВОБРАЗ ІРКІ”

*Масюкова Галіна Міхайлаўна*

**Мэта:** стварыць разгорнутую характарыстыку героя; развіваць уменні характарызаваць паводзіны і ўчынкі герояў; знаходзіць у тэксце мастацкія дэталі, апісанні, у якіх адлюстроўваецца аўтарская характарыстыка герояў.

**Задачы:**

садзейнічаць развіццю ўменняў вучняў аналізаваць, параўноўваць, выказваць і аргументаваць уласную думку;

ствараць умовы для развіцця пазнавальнай актыўнасці, крытычнага мыслення, увагі, вобразнага ўяўлення вучняў;

выхоўваць беражлівыя адносіны да навакольнага асяроддзя, жывёльнага свету.

**Тып урока:** аналіз мастацкага твора.

**Абсталяванне:** вучнёўскія ілюстрацыі да твора, прэзентацыя, раздатачны матэрыял (карткі “Белыя плямы”, карткі “5 з 25”, схема “Ірка якая?”)[1].

**Ход урока**

**І. Арганізацыйны момант.**

**1.1. Стварэнне псіхалагічнага настрою.**

Што парадавала вас сёння, калі вы ішлі ў школу?

Ці звярнулі ўвагу на прыроду, на ўсё тое, што акружала вас па дарозе ў школу? *(Сонца,першыя кветкі, спевы птушак, лісточкі на дрэвах і інш.)*

**1.2. Слова настаўніка.**

Вакол цудоўная прырода. Яна радуе нас, робіць жыццё чалавека рознакаляровым і шматгранным, стварае пэўны настрой. Трэба вучыцца заўважаць гэту прыгажосць, цаніць і берагчы яе. Вы, як і галоўная гераіня Ірка, насельнікі Зямлі нашай, і вам у будучым давядзецца займацца вырашэннем розных праблем, у тым ліку і экалагічных.

**ІІ. Мэтавызначэнне.**

*Вучні вусна фармулююць мэты ўрока.*

Буду ведаць...

Навучуся...

Змагу ...

**2.2. Вызначэнне тэмы і мэты ўрока настаўнікам.**

**2.3. Агучванне ключавых пытанняў урока.**

1. Душэўная драма Іркі. У чым яна? Хто вінаваты?

2. Ці даруе Ірка дарослым іх здраду і бесчалавечнасць?

**ІІІ. Работа з тэкстам мастацкага твора.**

**3.1. Чытанне вучаніцай верша М. Пазнякова “Кніга”.**

**3.2. Экскурсія ў “мастацкую галерэю” вучнёўскіх работ** (малюнкі вучняў на тэму прыроды, рэпрадукцыя карціны Г. Шапялевіч “У пушчы”).

**3.3. Гутарка.**

Што аб’ядноўвае кнігі і мастацтва?

Што падштурхнула вас, мастакі, да стварэння гэтых вобразаў?

Што яднае вашы малюнкі і творы мастацтва, змешчаныя ў падручніку?

Алені і Ірка. Як звязаны героі апавядання?

Чаму аўтар галоўную ролю ў творы адводзіць дзяўчынцы, а не дарослому чалавеку?

Як праз успрыманне дзяўчынкі раскрываюцца змест і праблемы твора?

[1]1. Бельскі, А.У. Беларуская літаратура: XI–XX ст.ст. / А.У. Бельскі, У.Г. Кароткі, П.І. Навуменка і інш. – Мн.: ТАА “Аверсэв”, 1999. – 415 с.
2. Лазарук, М.А. Урок літаратуры ў школе : Кніга для настаўніка / М.А.Лазарук, В.У. Івашын, Л.К. Цітова і інш. – Мн.: ТАА “Аверсэв”, 1999. – 415с.
3. Смыкоўская, В.І. Беларуская літаратура. 6 клас / В.І. Смыкоўская // Рознаўзроўневыя заданні: дапаможнік для настаўнікаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі. – Мн.: Аверсэв, 2005. – 208 с.

*Вывад: малюнкі, рэпрадукцыя карціны Г. Шапялевіч "У пушчы" і апавяданне І. Пташнікава "Алені" аб'ядноўвае хараство прыроды, яе непаўторнасць, багацце, каштоўнасць, прыгажосць. Захапленне навакольным светам.*

**3.4. Слова настаўніка.**

Ірка ведае прыроду, умее сябраваць з жыхарамі лесу, любіць іх. Усё прыгожае ў ёй выхавала прырода, на ўлонні якой яна вырасла. У прыроды Ірка навучылася дабру і чалавечнасці, справядлівасці і спагадзе. Без прыроды яна не ўяўляе свайго жыцця. Не прымае таго, што лес высякаюць. Падчас вайны чалавек і прырода дапамагалі адно аднаму. Чаму цяпер чалавек толькі спажывае лясныя багацці?

**3.5. Праца са схемай "Ірка — якая?".** (Дадатак 1).

Якая яна, галоўная гераіня апавядання?

**3.6. Запаўненне табліцы "Белыя плямы".** (Дадатак 2).

Як вы ведаеце прыроду? Наколькі ўважлівымі былі ў час чытання?

**3.7. Гульня ў перакладчыкаў "Знайдзі пару"**: устанавіць адпаведнасць слоў-назваў раслін, кветак, ягад, грыбоў па-беларуску і па-руску (дадаткі 3, 4), запісаць словы парамі[2].

*Вывад: вы, як і Ірка, умееце назіраць, бачыць прыгожае, рабіць абагульненні. Значыць, станеце добрымі ахоўнікамі нашай прыроды-маці.*

**3.8. Гутарка па змесце апавядання.**

Не ўсё добра склалася ў дзяўчынкі. Што стала прычынай душэўнай драмы Іркі?

Калі Ірка пачала адчуваць нешта нядобрае?

Як паказвае пісьменнік яе перажыванні?

Як паводзіць сябе Ірка, калі яе запрашаюць за стол? Чаму?

Як дарослыя аднесліся да гэтага ўчынку дзяўчынкі?

**3.9. Праца з карткай "5 з 25".** (Дадатак 5).

Якія душэўныя якасці Іркі праяўляюцца ў адносінах да аленяў? Да бацькоў? Да ўсяго жывога? Падбярыце пяць патрэбных слоў з запісаных на картцы "5 з 25".

Знайдзіце з дапамогай карткі "5 з 25" тыя якасці характару, якія ўласцівыя дарослым, агучце іх і аргументуйце

**3.10.Праблемныя пытанні.**

Ці ёсць апраўданне ўчынку бацькі? Што асуджае аўтар?

Душэўная драма Іркі. У чым яна? Хто вінаваты?

Ці даруе Ірка дарослым іх здраду і бесчалавечнасць?

**3.11. Гутарка-падагульненне.**

Як прырода дапамагае раскрываць характары герояў?

Што асуджае аўтар у сваім творы?

Як адносіцца пісьменнік да герояў і падзей? На чыім баку ён? Якая яго пазіцыя?

Сфармулюйце тэму і ідэю апавядання Івана Пташнікава "Алені". На якіх вобразах раскрываюцца?

*Вывад: пісьменнік спачувае Ірцы. Яе бацька — ляснік, ён ведаў, што алені ахоўваюцца дзяржавай. Ён павінен быў іх даглядаць, а ён становіцца браканьерам. Ірка не можа і не хоча зразумець, што зрабіў ён гэта дзеля яе, каб яна хоць смачней паела. Тым самым бацькі нанеслі дачцэ не толькі фізічную, але і душэўную траўму. Ірка магла загінуць у зімовым лесе ці памерці ад хваробы. Магла страціць веру ў чалавечую шчырасць і справядлівасць. Аўтар сцвярджае, што выхаванне гуманных, беражлівых адносін да прыроды — гэта архізначная задача. Рашаць яе будзем і мы з вамі.*

**3.12. Характарыстыка Іркі.**

Вусныя выказванні "Характарыстыка вобраза Іркі" (2–3 вучні).

**IV. Падагульненне.**

Як вы разумееце выказванне "Святы абавязак кожнага чалавека — быць сапраўдным гаспадаром зямлі"? Што для вас значыць выраз "гаспадар зямлі"? Паразважайце.

Давайце складзем правілы адносін да прыроды (агучванне правіл, метад "Святлафор": чырвоны — нельга, не...; жоўты — увага; зялёны — трэба.).

*У прыроды свае законы — спаконвечныя (В. Рагаўцоў).*

— Не парушаць законаў прыроды.

— Жыць у гармоніі з прыродай.

— Быць клапатлівым і міласэрным.

— Чалавек і прырода — непадзельнае цэлае.

— Берагчы і шанаваць прыроду — наш святы абавязак.

— Мы ў адказе за тых, каго прыручылі.

**V. Рэфлексія.**

Зразумеў, што...

Задумаўся ...

Мне захацелася...

**VI. Выстаўленне і каменціраванне адзнак.**

Хто задаволены сваёй работай на ўроку?

Як бы самі ацанілі сваю дзейнасць?

*Вывад: вы актыўна працавалі, аргументавана выказваліся, адстойвалі свае меркаванні. Пабылі ў розных ролях: і мастакамі, і перакладчыкамі, і даследчыкамі. Задаволена вашай працай на ўроку.*

**VII. Дамашняе заданне.**

*Дыферэнцыраванае заданне (на выбар вучняў):*

1 варыянт. Вуснае апавяданне "Як склаўся далейшы лёс Іркі?".

2 варыянт. Пераказ-замалёўка на адну з тэм: "Ірка і яе алені", "Ірчына пушча", "Свет Ірчыных захапленняў".

[2] Узаемаправерка вынікаў работы класа.

Дадатак 1

Схема "Ірка – якая?"




Дадатак 2

Табліца "Белыя плямы"

| № | Апісанне (можна з указаннем старонкі) | Назва прадмета |
|---|---|---|
| 1. | "Іх Ірка не любіла: яны зладзеі і стракочуць без аддухі, лезуць на двор у карытца да парасяці..." | |
| 2. | | Стракозы |
| 3. | "... за карчамі мые лапамі вушы. Нацёршы вушы, ён пакруціў мордачкай і паскакаў на горку" | |
| 4. | | Алені |
| 5. | "Сядзе на верасовую галінку, калышацца, пасля нахіне аж да самай зямлі, абдыме ножкамі, перагнецца ўся, адтапырыць крылцы і лезе з галоўкай у маленькую кветачку. Пасля застыне, не кранецца, як памерла – п'е..." | |
| 6. | | Баравікі |
| 7. | "Галава ў яго была зусім малая, вочы – сівыя, мутныя, поўсць блішчала, гладкая-гладкая, бы яе прычасаў хто. Грудзі ў яго ўсе аб'інелі, – відаць, дыхаў на іх". | |
| 8. | | Ірка |

Дадатак 3

Словы для перакладу

| | |
|---|---|
| АПЕНЬКІ | ОПЯТА |
| СЛІМАК | СЛИЗЕНЬ |
| ПАПАРАЦЬ | ПАПОРОТНИК |
| АЖЫНЫ | ЕЖЕВИКА |
| БРУСНІЦЫ | БРУСНИКА |
| ЖУРАВІНЫ | КЛЮКВА |
| КАЧКІ | УТКИ |
| ГІЛЬ | СНЕГИРЬ |
| ШЧУПАК | ЩУКА |

Дадатак 4

QR-код доступа к презентации

Дадатак 5

Апавяданне Івана Пташнікава "Алені" **(5 з 25)**
"Характарыстыка галоўнай гераіні"

Цікаўнасць, абыякавасць, нецярпімасць, стараннасць, спрытнасць, упартасць, улюбёнасць у прыроду, разважлівасць, чэрствасць, адказнасць, назіральнасць, дабрата, сур'ёзнасць, працавітасць, сумленнасць, жорсткасць, чуласць, спагадлівасць, летуценнасць, бессардэчнасць, справядлівасць, паслухмянасць, уражлівасць, любоў да бацькоў, міласэрнасць.

*Дата поступления в редакцию: 13.03.2024*

# ТВОРЧЕСКАЯ МАСТЕРСКАЯ «МЕЖПРЕДМЕТНЫЕ СВЯЗИ — ФАКТОР ФОРМИРОВАНИЯ МЕТАПРЕДМЕТНЫХ УМЕНИЙ И НАВЫКОВ УЧАЩИХСЯ»

*Бобровская Лилия Александровна*

**Цель мастерской:** планируется, что во время мастерской педагоги русского языка и литературы, белорусского языка и литературы актуализируют свои знания о межпредметной интеграции (интегрированные уроки), познакомятся с элементами технологии развития критического мышления через чтение и письмо, технологией проблемного обучения и технологией эффективного чтения.

**Задачи:**

создать проблемную ситуацию для осмысления содержания мастерской;

определить направления собственной деятельности в направлении межпредметной интеграции;

сформировать интерес к предлагаемому материалу, создать благоприятную эмоциональную атмосферу.

**I. Организационно-мотивационный этап.**

В XXI в. становится очевидным, что главная ценность личности — это способность к развитию, наличие познавательного потенциала. Потребность познавать — главная составляющая духовности человека наряду с потребностью творить добро и сострадать. По словам В. Вернадского, «человек разумный — и